*А. А. Трусаў,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў, кандыдат гістарычных навук*

# БЕЛАРУСКАЯ ГРАМАДЗЯНСКАЯ МАНУМЕНТАЛЬНАЯ АРХІТЭКТУРА XII ст.

У XII ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала некалькі архітэктурных школ, якія збудавалі дзесяткі манументальных будынкаў як культавага, так і свецкага ды абароннага прызначэння. Аднак у сучаснай навуковай і асабліва навукова-папулярнай літаратуры гаворка ідзе ў асноўным пра праваслаўныя храмы.

У сувязі з гэтым варта звярнуць увагу на такую ўнікальную з'яву, як мураваныя рэзідэнцыі мясцовых князёў – архітэктурныя комплексы з парадных каменных і жылых драўляных будынкаў у цэнтры гарадскіх дзядзінцаў. Гэта палацы (альбо харамы) у Чарнігаве, Полацку, Смаленску і Гродна. Доўгі час пра іх выгляд і планіроўку ніхто нічога не ведаў, і таму іх рэшткі не маглі дакладна вызначыць.

Упершыню ў 1932–1933 гг. Язэп Ядкоўскі, які кіраваў землянымі работамі на тэрыторыі Старога замка ў Гродне, знайшоў рэшткі будынка XII ст. і вызначыў яго як княжацкі палац («церам»). З ім пагадзіўся рускі эмігранцкі даследчык Салаў'ёў, які агледзеў вынікі раскопак Ядкоўскага ў верасні 1934 г. Ад будынка засталася толькі паўночная частка. Сцяна будынка даўжынёй 9,72 м захавалася на вышыню 2 м, пасярэдзіне дзвярны праём – 1,63 м. Унутраныя сцены палаца былі аздоблены нішамі шырынёй каля 1 м і вышынёй 1,85 м.

Палац, відаць, быў двухпавярховы і меў драўляныя перакрыцці на бэльках. Зроблены ён з плінфы ў раўнаслойнай тэхніцы. Памер цаглін 4–5 × 18–20 × 29,5–31 см. На тарцах плінфаў маюцца знакі. Звонку ў муроўку палаца былі ўкладзены амаль неапрацаваныя камяні. Падмурак уяўляе сабой рад камянёў, пад якімі знаходзіцца праслойка бітай цэглы і вапны. Агульная таўшчыня яго 35–40 см, ён упушчаны ў культурны слой XI–XII стст. Пры раскопках будынка знойдзены паліваныя пліткі падлогі XII ст. (у тым ліку і фігурныя), зліткі аплаўленага свінцу (відаць, ад лістоў пакрыцця даху) і шматлікія бытавыя рэчы XII ст.

Пазней, у канцы XIV – пачатку XV ст., да палаца быў пры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

будаваны ганак з вялікапамернай цэглы, на якой прасочана некалькі метак. Да гэтага часу можна аднесці каменныя гарматныя ядры, якія знойдзены ў памяшканнях будынка. Палац быў разбураны ў XVI ст. падчас перабудовы Старога замка Стэфанам Баторыем.

Нягледзячы на тое, што Я. Ядкоўскі і іншыя даследчыкі 30-х гг. XX ст. лічылі вышэйназваную пабудову княжацкім палацам, М. Варонін сцвярджаў, што дадзены будынак – рэшткі абарончай вежы. Даследчык лічыў, што будынак узведзены крыху пазней, чым ніжняя царква, і спасылаўся на стратыграфію раскопу [2].

Яшчэ Ядкоўскі звярнуў увагу на знакі на цэгле са сцен палаца [8]. Яны былі аб’ёмныя, бо іх выразалі на бакавых сценках формы для вырабу плінфы толькі на доўгіх баках цаглін. Сярод знакаў шмат экзэмпляраў у выглядзе літар, крыжоў, стрэлак, розных геаметрычных фігур. Вылучаецца група знакаў з княжацкай сімволікай, прычым М. Варонін знаходзіць ім аналагі сярод драгічынскіх пломбаў. Ён пагадзіўся з папярэднімі даследчыкамі ў тым, што знак двузуба з крыжам увёў ва ўжытак гродзенскі князь Усевалад Давыдавіч. М. Варонін звярнуў увагу на фрагменты іншага збудавання на мысе Замкавай гары над вусцем рэчкі Гараднічанкі.

Ён выказаў прыгожую гіпотэзу, што на замкавым мысе стаялі дзве абарончыя цагляныя вежы, якія былі злучаны паміж сабою землянымі валамі з драўлянымі сценамі на іх. Княжацкі палац, на яго думку, знаходзіўся на ўсходняй частцы дзядзінца, на месцы, дзе потым быў збудаваны палац Стэфана Баторыя ў XVI ст. (раскопкі 1981 г.).

Аднак думка Вароніна была аспрэчана намі (сумесна з П. Рапапортам). Ядкоўскі пры раскопках гэтага будынка знайшоў шмат маёлікавых плітак, шкляных бранзалетаў, шыферных праселак і рыбалоўных грузілаў. Але рэчаў вайсковага рыштунку тут не знайшлі. Такая колькасць дарагіх побытавых рэчаў, тонкія сцены, аздобленыя маёлікавай пліткай, і адпаведная прыгожая падлога з керамічных плітак сведчаць аб свецкай функцыі пабудовы.

Гэтае меркаванне было пацверджана ў выніку даследаванняў П. Рапапорта і аўтара артыкула (раскопкі 1981 г.). Даследчыкі прывялі доказы адносна грамадзянскага прызначэння гэтай пабудовы і выказалі думку, што абарончую функцыю яна магла выконваць у канцы XIV–XV ст., калі яна ўвайшла ў склад мураванага замка, збудаванага Вітаўтам.

Рэшткі другога мураванага збудавання не культавага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызначэння знойдзены ў 30-х гг. мінулага стагоддзя на самім мысе Замкавай гары над вусцем Гараднічанкі. Гэта мураваныя абарончыя сцены.

Упершыню рэшткі адной з каменных сцен, складзенай з плінфы (кавалак даўжынёй каля 4,5 м і вышынёй каля 1,8 м), знойдзены З. Дурчэўскім у 1937 г. на самым мысе Замкавай гары. У 1949 г. старажытны мур умацаваў бетоннай сценкай М. Варонін. Ён выказаў меркаванне, што гэта рэшткі каменнай абарончай вежы драўлянага гарадскога дзядзінца.

Вывучэнне помніка было працягнута ў 1981 г. Канчаткова рэшткі каменных муроў былі вывучаны намі ў 1985–1986 гг. і ў 1988 г. Вынікі даследавання 1985 г. надрукаваны [6].

Чарнігаўскі палац археолагі Багусевіч і Халастэнка знайшлі і раскапалі ў 1950–1951 гг. на тэрыторыі дзядзінца паміж Спаскім і Барысаглебскім саборамі. Гэта быў квадратны ў плане будынак (7,5 х 7,5 м). Таўшчыня сцен – 1,4 м. На вуглах – плоскія лапаткі. Шырыня дзвярнога праёма паўночна-заходняга фасада будынка – 76 см. Цэгла мае знакі на тарцах і меткі на пасцелях. Сцены былі распісаныя фрэскамі. Глыбіня падмуркаў – 1,1 м. Пад падмуркам прасочана сістэма драўляных лаўшоў, змацаваных меднымі штырамі. Даследчыкі вызначылі час пабудовы палаца – другая палова XI ст. [1].

Смаленскі палац знойдзены на тэрыторыі дзядзінца, на ўскрайку Замкавай гары побач з дзеючым саборам у 1965 г. Аўтары раскопак Варонін, Рапапорт і Чарных.

Захавалася паўночна-заходняя сцяна будынка даўжынёй 7,8 м і часткова – паўднёва-заходняя. Ацалелая муроўка мела вышыню да 1,5 м. Таўшчыня сцен – 77 см. На цэгле палаца сустракаюцца знакі на тарцах і клеймы на пасцелях.

Шырыня падмурка – 80 см, глыбіня толькі 20–30 см. Гэта 1–2 шэрыя валуны на вапнавай рошчыне. Будынак меў сутарэнне (падклет). Даследчыкі лічыць, што палац быў двухпавярховы, столь абапіралася на драўляныя бэлькі і ўзведзена ў сярэдзіне XII ст. У XIII ст. палац быў адрамантаваны [3].

Рэшткі Полацкага княжацкага палаца былі знойдзены падчас земляных работ на Верхнім замку ў 1972 г. У 1976 г. будынак раскапаны Паўлам Рапапортам. Гэта быў прамавугольны ў плане будынак (4,7 х 4,2 м) з невялікай прыбудовай каля заходняга фасада (2,5 х 2,4 м) Захаваліся часткова падмуркі палаца шырынёй 50–70

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

см. Будынак меў падвал глыбінёй 1,5 м. На тарцах некаторых цаглін сустракаюцца знакі. На пасцелі адной з цаглін ёсць кляймо. Глыбіня падмуркаў 1,8 м. Даследчык лічыць, што палац быў збудаваны ў другой палове XII ст.

У XIV ст. да палаца з поўначы была прыбудаваная драўляная пабудова (4,9 х 5 м), зробленая з магутных драўляных брусоў, сцены знутры былі абмазаны глінай. Памяшканне ацяпляла вялікая печ, складзеная з выкарыстаннем гаршковай кафлі. Канчаткова пабудову вывучылі ў 1977 г. [4].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што пабудова каменных княжацкіх палацаў – характэрная з’ява для заходняй часткі ўсходнеславянскіх земляў у XII ст.

---


1. *Богусевич, В. А.* Черниговские каменные дворцы XI–XII вв. / В. А. Богусевич, Н. В. Холостенко // Краткие сообщения Института археологии Украины. – 1952. – Вып. 1. – С. 32–42.

2. *Воронин, Н. Н.* Древнее Гродно / Н. Н. Воронин. – М., 1954. – С. 129–130.

3. *Раппопорт, П. А.* Русская архитектура X–XIII вв.: каталог памятников / П. А. Раппопорт. – Л.: Наука, 1982. – С. 90.

4. *Раппопорт, П. А.* Дворец в Полоцке / П. А. Раппопорт, Е. В. Шолохова // Краткие сообщения Института археологии АН СССР. – 1981. – Вып. 164. – С. 92.

5. *Соловьев, Л. В.* Новые раскопки в Гродно и их значение для русской истории / Л. В. Соловьев // Зап. Рус. науч. ин-та в Белграде. – Белград, 1935. – Вып. 13. – С. 80–81.

6. *Трусов, О. А.* Памятники монументального зодчества Белоруссии XI–XVII вв. / О. А. Трусов. – Минск: Наука и техника, 1988. – С. 30–31.

7. *Jodkowski, J.* Grodno wczesnosrednowiecznie w swietle prac wykopaliskowych dokonanych na Krolewskim Zamku Starym w Grodnie w latach 1932 i 1933 / J. Jodkowski // Przeglad historyczno-wojskowy. – Warszawa, 1934. – T. 12. – Z. 1.

8. *Jodkowski, J.* O znakach na cegle «teremu» ksiazecego w Grodnie: (оттиск из WNA, t. XV, 1933) / J. Jodkowski. – Krakow, 1934.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ